ВЫДАЕЦЦА З 2007 ГОДА

# Наша Газета

КАСТРЫЧНІК 2011

ПЕРШАЯ ГАЗЕТА ДЛЯ ПЕРШАЙ ШКОЛЫ

**ЗВЯРНІЦЕ ЎВАГУ:**

- **Вельмі хутка набяруць моц усе магчымыя цяжкасці навучальнага года і для вучняў пачнуцца сапраўды «гарачыя» дзянёчкі**
- **Па вялікім рахунку, «гарачыя» дні для іх пачаліся ўжо зараз—вучні 9 «А» класа бяруць удзел у 1 этапе конкурса праектаў «Адраджэнне гістарычнай памяці Крычаўшчыны»...**



**У ГЭТЫМ НУМАРЫ:**

Хто будзе ўдзельнічаць у конкурсе?... (экспрэс-навіны) 1

Выпрацаваны накірункі працы па праекце... 2

І з мятлой і з кампутарам... 3

Нашы справы працягваюцца ... 4

## Палажэнне аб конкурсе

**Выбарачныя палажэнні аб школьным конкурсе "Адраджэнне гістарычнай памяці Крычаўшчыны":**

1.Конкурс праводзіцца з 1 верасня да 1 лістапада 2011 года ў тры этапы: з 1 верасня да 1 кастрычніка (на ўзроўні ўсёй школы); з 2 кастрычніка да 15 кастрычніка (на ўзрўні 5 каманд-фіналістаў); 1 лістапада (супер-фінал на ўзроўні 2 каманд-фіналістаў).

2. Камандам прапануецца падрыхтаваць мэтавы комплекс мерапрыемстваў па папулярызацыі гісторыі роднай Крычаўшчыны, а таксама распрацаваць адпаведны праект.

3. Праект павінны складацца з 2-х частак—тэарэтычнай і практычнай.

4. Пераможцы вызначаюцца па найбольшай суме балаў, што выстаўляюцца членамі спецыяльнага школьнага журы (старшыня Кайрыс В.С.) па дзесяцібальнай сістэме.

5. Скласці справаздачу аб праведзеных мерапрыемствах.



***- Мы паўдзельнічаем у конкурсе?***

***- Канешне паўдзельнічаем!***

6. Па выніках першых двух этапаў выз-начаюцца пераможцы-фіналісты з ліку ўсіх каманд-удзельніц (2 каманды), якія і возьмуць удзел у супер-фінале, вынікі якога будуць падведзеныя 1 лістапада 2011 года ў актавым зале школы.

8. Пераможцы конкурса ўзнагароджваюцца дапломамі, памятнымі сувенірамі і каштоўнымі падарункамі.

## Хто будзе ўдзельнічаць у конкурсе?

### (Экспрэс-навіны)



**1 кастрычніка 2011 года 14.30**

**<u>Прамежкавыя спаборніцтвы сярод вучняў школы за права паўдзельнічаць у конкурсе “Адраджэнне гістарычнай …”</u>**

Каманды з 11”А”, 11”Б”, 10”А”, 9”А” і 8”А” класаў узялі ўдзел у спецыяльна распрацаванай эстафеце па вызначэнні супер-фіналістаў прамежкавых спаборніцтваў. Толькі лепшыя маглі прэтэндаваць на ганаровае права пазмагацца за перамогу!



**15 кастрычніка 2011 года 17.30**

**<u>Нарэшце вызначаны суперфіналісты, а так сама лепшыя ў асабістым заліку</u>**

Сярод фіналістаў, што заваявалі права далей пазмагацца за права ўдзелу ў конкурсе апынуліся 11 “А” і 9 “А” класы!. Лепшай у асабістым заліку стала вучаніца 9 “А” класа Алена Шыліна!



**1 лістапада 2011 года 14.30-16.00**

**<u>Напружаны момант– кампетэнтнае журы вызначыла пераможцу! Суперфінал даў вынік!</u>**

Па рэзультатах прамежкавых спаборніцтваў і суперфіналу, пераможцай прызнаецца каманда 9 “А” класа. Яна атрымала каштоўныя падарункі, а таксама права пры падтрымцы школы рэалізаваць свой праект. Віншуем!

# У цэнты ўвагі—Крычаў



*Непаўторны вобраз Крычава на фотаздымку пач. XX ст.*

Наш горад з'яўляецца самым значным і самым буйным населеным пунктам на ўсходзе Магілёўшчыны. Усю сваю гісторыю Крычаў заставаўся невялікім, так бы мовіць, "малым" горадам, якіх нямала на мапе Беларусі. Разам з тым, ён граў дастаткова значную ролю ў палітычным, эканамічным, а найперш, ваенным жыцці рэгіёна. З'яўляючыся цэнтрам абароны ўсёй акругі і памежнай крэпасцю, Крычаў доўгія стагоддзі надзейна абараняў межы радзімы.

Аднак нягледзячы на гэта, нягледзячы на дзевяцівекавую слаўную крычаўскую гісторыю і традыцыі, што ўходзяць сваімі каранямі ў сівую беларускую мінуўшчыну, існуе рэальная пагроза знікнення памяці пра мінулае, канчатковай страты нацыянальнай самасвядомасці, гонару за свой горад. Ці здагадваюцца гараджане пра сапраўдную гісторыю места? Ці шмат ведаюць пра гістарычныя, архітэктурныя, археалагічныя ці культурныя каштоўнасці "малой радзімы"? Ці ганарацца яны нашым адзіным у свеце, непаўторным і самабытным Крычавам?...

Зыходзячы з гэтага, існуе патрэба ў распрацоўцы пэўнага праекта, плана дзеянняў па выпраўленні сітуацыі, па данясенні да свядомасці грамадзян важнасці і непаўторнасці гістарычнага твару горада.

***А. Шыліна, 9 "А"***

*Абапіраючыся на разуменне праблемы і жаданне паспрыяць яе вырашэнню, а таксама бяручы на сябе адказнасць за лёс роднага горада...*

# Мы выпрацавалі накірункі працы

Абапіраючыся на разуменне праблемы і жаданне паспрыяць яе вырашэнню, а таксама бяручы на сябе адказнасць за лёс роднага горада, вучні 9 "А" класа разам з настаўнікамі гісторыі распрацавалі наступнпныя мерапрыемствы ў рамках практычнай часткі праекта "Адраджэнне гістарычнай памяці Крычаўшчыны":

1.Папулярызацыя гісторыі, гістарычных і архітэктурных аб'ектаў Крычаўшчыны сярод зацікаўленых;
2. Пасільная ўборка і ўпрыгожванне гістарычных і архітэктурных помнікаў Крычаўшчыны;
3. Выдавецкая дзейнасць, звязаная з гісторыяй і фальклорам Крычаўшчыны;
4. Стварэнне базы мультымедыйных кампанентаў па гісторыі Крычаўшчыны;
5. Экскурсіі і пошукавыя экспедыцыі сіламі вучняў і настаўнікаў;
6. Тэматычныя пазакласныя мерапрыемствы і заняткі для вучняў;
7. Удзел у гістарычных і краязнаўчых конкурсах, у там ліку і міжнародных.

# Папулярызацыя гісторыі



*З асаблівасцямі крычаўскай гісторыі знаёмяцца па ўсёй краіне!*

Дадзены накірунак працы прадугледжвае, папершае, усемагчымы распаўсюд інфармацыі пра гісторыю, фальклор, архітэктуру і іншыя адметнасці Крычаўшчыны ў сродках масавай інфармацыі, а падругое, сустрэчы вучняў з цікавымі людзьмі - гісторыкамі, археолагамі, нумізматамі і г.д.

На сённяшні дзень у гэты накірунак ужо зроблены немалы ўнёсак. Напрацягу 2007-2011 гг. у разнастайных сродках масавай інфармацыі (Краязнаўчая газета, Настаўніцкая газета, часопіс "Гісторыя. Праблемы выкладання" і г.д.) апублікавана вялікая колькасць краязнаўчых матэрыялаў па гісторыі Крычаўшчыны. У свой час ладзіліся сустрэчы вучняў з кандыдатамі гістарычных навук А. Мяцельскім і А. Агеевым, іншымі гісторыкамі. Такія сустрэчы плануюцца і надалей.

***С. Крупкіна, 9 "А"***

# Уборка і ўпрыгожванне

Мяне клічуць Славяна. Я вучуся ў нашай школе ў 9 класе. Вы ўсе мяне добра ведаеце. Я люблю нашу школу. Сапраўды. Я люблю горад, у якім жыву. Пра яго архітэктуру, гістарычныя і культурныя адметнасці можна пісаць велізарныя творы. У Крычаве можна знайсці нямала цікавага і пазнавальнага, але… Як шмат гэтых але. Вялікую колькасць бліскучых архітэктурных ды гістарычных помнікаў наш горад згубіў яшчэ за савецкімі часамі. Зараз, здаецца, да грамадства прыйшло разуменне каштоўнасці гістарычнай спадчыны - тое-сёе нават робіцца для яе захавання. Напрыклад, цудоўна адрэстаўраваны палац Галынскіх, які чамусьці афіцыйна называюць палацам Пацёмкіна. Аднак, разам з тым, добры дзесятак гістарычных аб'ектаў знаходзіцца ў занядбаным стане. Мы, навучэнцы школы, вырашылі, па меры сіл, выпраўляць сітуацыю. Канешне, мы не можам рэстаўраваць іх, не можам кансерваваць, не можам нават ахоўваць, аднак навесці там элементарны парадак, убраць бруд і бітае шклянне - гэта ў нашых сілах. Вось ужо другі года запар, у рамках нашага школьнага праекта па добраўпарадкаванні аб'ектаў гістарычнай спадчыны Крычава, вучні розных класаў СШ №1 двойчы на год—летам і вясной, праводзяць "санітарную апрацоўку" гістарычных аб'ектаў горада. З мяцёлкамі і граблямі, мяхамі для смецця і добрым настроем, мы накіроўваемся да Замкавай гары—гістарычнага сэрца Крычава, былой вінакурні XVIII стагоддзя, царкоўна-прыходскай школы XIX ст., народнага вучылішча XIX ст. і рэшткаў рамеснага вучылішча пач. XX ст., да гарадзішча "Гарадзец", Святога калодзежа, ды іншых важных аб'ектаў. Мы мяцём, грабаем, чысцім… Некалькі гадзін агульнай працы на свежым паветры прыносяць толькі пазітыўны настрой, стымулююць арганізм і нават духоўны мір! Часам, калі размова ідзе пра так званы Святы калодзеж, мы сумяшчаем уборку і адпачынак, —невялікі пікнік у лесе з'яўляецца своеасаблівым бонусам для стомленых працаўнікоў. Ну і, зразумела, мы не пакідаем пасля сябе ніякіх рэштакаў нашага адпачынку. Такім чынам, гэты наш школьны праект не вырашае праблемы ў цэлым, але давзваляе нам выканаць наш абавязак перад продкамі.

***Славяна, 9 "А"***



***Гэты будынак у добрым стане, але прыбраць вакол ягоне заміне!***



***На Замкавай гары - работы хоць адбаўляй***



***Тут працуем, а тут можна і адпачыць!***



***Мы і тут папрацуем з задавальненнем!***



## Наша выдавецкая дзейнасць

На сённяшні дзень існуе ўсяго некалькі друкаваных выданняў прысвечаных гісторыі Крычаўшчыны. Перш за ўсё гэта, канешне, грунтоўная праца ст. навуковага супрацоўніка інстытута гісторыі Акадэміі навук Андрэя Мяцельскага "Старадаўні Крычаў". Амаль усе астатнія—гэта безнадзейна састарэлыя выданні, якія абсалютна не адпавядаюць рэальнай гісторыі раёна. Зыходзячы з гэтага, існуе вострая патрэба сістэматызаваць і прадставіць крычаўцам і ўсім ахвочым друкаваную інфармацыю пра гісторыю, гістарычных асобаў, фальклор і архітэктурную спадчыну раёна. Работа гэта вельмі складаная, адказная і, галоўнае, дарагая ў грашовым сэнсе. Між тым, у рамках школьнага праекта па распрацоўцы і выпуску друкаванай прадукцыі па гісторыі Крычаўшчыны, вучнямі СШ №1 ужо выдадзены зборнік "Дваццаць пяць гістарычных каштоўнасцяў Крычава" і тэматычны буклет, перыядычна выходзіць у свет "Наша газета", практычна гатова да друку брашура, прысвечаная кароткай гісторыі Крычава. Распачалася праца па збору матэрыялаў для брашуры "Фальклор Крычаўшчыны". Такім чынам, работа ідзе!



***Нашы выданні***

***С. Крупкіна, 9 "А"***

# Наша газета

Рэдакцыя школьнай газеты «Наша газета»,
ДУА «СШ№1 г. Крычава»,
вул. Супрунова, 7,
213500 г. Крычаў, Магілёўская вобл.,
Беларусь
Тэл.: +375 (2241) 53509

Рэдактар—К. Дабыдоўскі (9"А" клас)
Газета выходзіць 1 раз на 2 месяцы
Распаўсюджваецца бясплатна
Наклад 50 асобнікаў

Наш дэвіз:

**Першая** газета для **першай** школы

## Стварэнне мультымедыя-кампанента



*Работа над мультымедыя*

Не сакрэт, што выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій пры вывучэнні гісторыі, з'яўляецца надзвычай перспектыўным напрамкам у развіцці сучаснай педагогікі і не можа не выклікаць падвышанага інтарэса. Зыходзячы з гэта, настаўнікамі гісторыі і вучнямі СШ №1 вядзецца мэтанакіраваная праца па распрацоўцы мультымедыйных заняткаў па гісторыі Крычаўшчыны. Ужо створана і апрабавана на справе мультымедыйная прэзентацыя "Жыць у любым Крычаве і не любіць яго—немагчыма". Падобная работа працягваецца!

***М. Маскалёва, 9 "А"***

## Экскурсіі і пошукавыя экспедыцыі



*Апытанне старажылаў*

Час ідзе… Раз за разам сыходзяць сведкі даўно мінулых падзей… Зыходзячы з разумення дадзенай праблемы, настаўнікі і вучні СШ №1 у рамках спецыяльнага школьнага праекта, перыядычна праводзяць пошукавыя экспедыцыі і апытанні.

***К. Дабыдоўскі, 9 "А"***




## Наша жыццё




# Пазакласныя мерапрыемствы












Школьная праграма ў нашай краіне не прадугледжвае, нажаль, вывучэнне мясцовай гісторыі. А вывучаць яе жыццёва неабходна. Зыходзячы з разумення гэтай праблемы, у рамках школьнага праекта па ўкараненні краязнаўства ў адукацыйны працэс, у СШ №1 распрацаваны і праводзяцца шматлікія краязнаўчыя пазакласныя мерапрыемствы. Вядзецца мэтакіраваная праца па стварэнні адаптаванай праграмы для факультатыўных заняткаў па крычаўскаму краязнаўству.

***В. Гусяцкая, 9 "А"***



*Вучні 9 "А" - краязнаўцы*

# Удзел у гістарычных конкурсах



Як развівацца ў інтелектуальным і гістарычным плане, як самарэалізавацца і адчуць сябе пераможцам? Для навучэнцаў школы ёсць толькі адно выйсце—удзел у разнастайных конкурсах. Зыходзячы з разумення гэтага, пры садзеянні настаўнікаў гісторыі, вучні СШ №1 бяруць удзел ва ўсіх магчымых конкурсах па гісторыі і каязнаўству. У тым ліку і ў міжнародных. Напрыклад, зусім нядаўна—увосень, каманда 9 "А" перамагла ў рэспубліканскім гістарычным конкурсе школьных каманд "Што я ведаю пра Еўропу". І спыняцца на гэтым не збіраемся!

***К. Дабыдоўскі, 9 "А"***